# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ПРАФЕСАРА Я. А. ЮХО

***І. А. Доўнар***

*Беларускі дзяржаўны утверсітэт*

Язэп (Іосіф) Аляксандравіч Юхо ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускай гісторыка-прававой навукі. У 1956 г. ён стаў выкладчыкам юрыдычнага факультэта, дзе потым актыўна займаўся навуковай дзейнасцю. Упершыню на юрыдычным факультэце ён пачаў выкладаць гісторыю дзяржавы і права Беларусі. Апублікаваў звыш 200 навуковых прац, у тым ліку некалькі манаграфій і шмат навучальных дапаможнікаў. Падрыхтаваў звыш дзесяці дактароў і кандыдатаў юрыдычных навук. Асаблівая заслуга прафесара Юхо ў тым, што ён стаў заснавальнікам навуковай гісторыка-прававой школы Беларусі.

Навуковыя працы Я. А. Юхо прысвечаны самым розным і вельмі актуальным праблемам гісторыі дзяржавы і права Беларусі – паходжанню назвы «Беларусь», узнікненню беларускай дзяржаўнасці, фарміраванню тэрыторыі Беларусі, помнікам айчыннага права, прававому становішчу насельніцтва, уніям Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) з Польшчай, уплыву Польшчы і Расіі на гісторыю беларускага народа, гісторыі заканадаўства, прававым поглядам беларускіх мысліцеляў, значэнню гісторыка-прававой навукі і інш. Так, ім упершыню была выказана думка аб непасрэдным удзеле вялікага беларускага гуманіста і мысліцеля Ф. Скарыны ў падрыхтоўцы знакамітага звода законаў – Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Ён выказаў уласныя пазіцыі па праблеме фарміравання тэрыторыі Беларусі, абгрунтаваў тэзіс аб значна больш старажытным паходжанні беларускай дзяржаўнасці, чым было афіцыйна вызначана ў савецкай гістарычнай навуцы, аб пераважна беларускім этнічным характары Вялікага княства Літоўскага, адзначыў мінулыя айчынныя прававыя набыткі, значнасць і прагрэсіўнасць поглядаў шматлікіх беларускіх мысліцеляў, дзяржаўных дзеячаў мінулага перыяду і г. д. Напрыклад, некалькі навуковых прац ён прысвяціў выдатнаму дзеячу нацыянальна-вызваленчага руху XVIII ст. Тадэвушу Касцюшку, які пакінуў значны след у палітычным жыцці не толькі шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, але і ў Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе змагаўся за

незалежнасць гэтай краіны.

Я. А. Юхо ўдзельнічаў у падрыхтоўцы многіх энцыклапедычных выданняў, прысвечаных жыццю і навуковай творчасці беларускіх мысліцеляў: «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» (Мінск, 1995), «Асветнікі зямлі беларускай» (Мінск, 2003) і інш.

У манаграфіі «Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI ст.», выдадзенай у 1978 г. на падставе доктарскай дысертацыі, ён характарызуе структуру феадальнага грамадства, раскрывае прававы статус самага прывілеяванага саслоўя шляхты, гаворыць аб становішчы гарадскога насельніцтва, асабліва тых гарадоў, якія мелі Магдэбургскае права, акцэнтуе ўвагу на тым, што і беларускія сяляне мелі некаторыя правы, а не толькі значную колькасць абавязкаў.

Кніга «Крыніцы беларуска-літоўскага права» (Мінск, 1991) была прысвечана характарыстыцы важнейшых нарматыўных актаў, якія дзейнічалі на працягу стагоддзяў у Беларусі: агульназемскіх, абласных, валасных, гарадскіх грамат, Судзебніка 1468 г., Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. і інш. На падставе сістэмнага аналізу помнікаў права ён зрабіў вывад аб нацыянальнай адметнасці беларускага права і параўнальна высокай тагачаснай прававой культуры беларускага народа.

У манаграфіі Я. А. Юхо «Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі» (Мінск, 1999) даецца характарыстыка навуковых літаратурных твораў, у якіх разглядаліся або закраналіся пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама іх крытычная ацэнка. Асабліва ён крытыкаваў погляды польскіх навукоўцаў адносна несамастойнасці Беларусі і значным уплыве польскага права.

Па ініцыятыве Я. А. Юхо і дзякуючы яго намаганням былі перавыдадзены некаторыя помнікі права Беларусі, у тым ліку Статут ВКЛ 1588 г. (Мінск, 1989), Статут ВКЛ 1566 г. (Мінск, 2003).

Шэраг кніг Я. А. Юхо («Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 1992), «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 2000) і інш.) да гэтага часу з’яўляюцца важнейшымі навучальнымі дапаможнікамі для студэнтаў-юрыстаў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Патрэбна падкрэсліць, што прафесар Я. А. Юхо, які паважаў і любіў студэнтаў, у сваіх лекцыях, а таксама публікацыях імкнуўся абудзіць у кожнага студэнта самастойнасць мыслення, актыўную жыццёвую

пазіцыю і любоў да роднай Айчыны. Ён з’яўляўся таленавітым педагогам, які выхаваў не адно пакаленне студэнтаў.

Увогуле ўся творчая, навуковая спадчына доктара юрыдычных навук, прафесара Я. А. Юхо будзе яшчэ доўга ўплываць на развіццё гісторыка-прававой навукі Беларусі і служыць прыкладам служэння навуцы, праву і нашай Айчыне.